УДК 796 (476) (091)

# СПАРТЫЎНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНІЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА МЯЖЫ XIX–XX СТАГОДДЗЯЎ

**Бусько Сяргей Іванавіч**
дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры»;
кандыдат гістарычных навук

*Артыкул прысвечаны забеспячэнню фізкультурна-спартыўнай дзейнасці неабходным абсталяваннем у беларускіх губернях у пачатку XX стагоддзя. Аўтар разглядае крыніцы паступлення спартыўнага інвентара ў рэгіён, наяўнасць мясцовай вытворчай базы, рэкламу. Фарміраванне культуры баўлення вольнага часу разглядаецца як адзін з паказчыкаў мадэрнізацыйных працэсаў у беларускім грамадстве.*

Спартовае абсталяванне – гэта прылады для заняткаў фізічнай культурай і спортам, якія вырабляюцца ў адпаведнасці са стандартамі, зацверджанымі міжнароднымі альбо нацыянальнымі спартовымі федэрацыямі і зарэгістраванымі ў міжнародных або дзяржаўных арганізацыях. Асноўныя групы спартыўнага абсталявання і рыштунку: адзенне (форма), абутак, снарады (апараты), інвентар і апаратура для абсталявання спартыўных збудаванняў і абслугоўвання спаборніцтваў.

Беларускія губерніі знаходзіліся ў супярэчлівым становішчы. Запаволеныя працэсы мадэрнізацыі, аграрны характар заняткаў асноўнай часткі насельніцтва, маруднае станаўленне гарадской цывілізацыі ў беларускіх губернях (у тым ліку і невысокія памеры заробкаў) прывялі да больш позняга пачатку фарміравання цікавасці да фізічнай культуры і спорту сярод насельнцтва (напрыклад, пры параўнанні з Рыгай, Адэсай, Кіевам). З іншага боку, прысутнічалі агульнарасійскія тэндэнцыі – увядзенне гімнастыкі ў арміі і заняткаў па фізічнай культуры ў сістэме адукацыі, фарміравалася агульная інфармацыйная прастора Расійскай імперыі (газеты, спаборніцтвы і інш.). Культурны ўплыў з боку Царства Польскага сутыкаўся з навінкамі, што прыходзілі з Масквы і Санкт-Пецярбурга.

Рост попыту на спартыўнае абсталяванне на мяжы XiX–XX стст. задавальняўся некалькімі рознымі спосабамі: паступленні з еўрапейскіх краін, зборка ці капіраванне на месцы, уласна расійская вытворчасць. На першым этапе станаўлення сістэмы фізічнага выхавання і спорту ў беларускіх губернях Расійскай імперыі (як і ў цэлым па краіне за выключэннем сталіц) забеспячэнне пачатковых патрэб спартыўным абсталяваннем ажыццяўлялася праз пастаўкі з еўрапейскіх краін. Так, Радзівілы закуплялі неабходны інвентар у Велікабрытаніі і Германіі. Граф К. Любамірскі прывёз у Вільню захапленне тэнісам з падарожжа ў Велікабрытанію, адтуль і быў выпісаны ўвесь інвентар, Юзаф Тышкевіч спартовае абсталяванне для сядзібы ў Ландварава (Віленская губернія) таксама набыў за мяжой [8, с. 71]. Усе ровары ў беларускіх губернях да канца XIX ст. былі прывезены з Францыі, Аўстра-Венгрыі, Германіі, Велікабрытаніі, аб гэтым яскрава сведчыць як рэклама тагачасных магазінаў Вільні, Бярэсця і Менску, так і ўспаміны аматараў [3]. Узнікаюць складанасці з вызначэннем крыніц паставак спартыўнага абсталявання для арміі і ўстаноў сістэмы адукацыі – наяўныя дакументы дазваляюць выявіць аб'ёмы закупак, але да пачатку XX ст. не пазначаецца месца вытворчасці. Па архіўных дакументах прасочваецца цэнтралізаваны характар закупак абсталявання праз Віленскую навучальную акругу.

Па меры росту спажывецкага попыту ўзнікаюць дзве новыя тэндэнцыі, мэтай якіх была відавочная спроба знізіць выдаткі: самастойны выраб і сборка часткі абсталявання і закупка камплектуючых з далейшым цыклам сборкі на месцы. Аб гэтым сведчаць матэрыялы гімназій, напрыклад, кіраўніцтва Беластоцкага рэальнага вучылішча аплаціла працу мясцовага сталяра (ён браў на сябе пабудову гімнастычнага гарадка), а ў заяўцы ў Вільню былі пазначаны толькі ракетнае і тэніснае абсталяванне [4, арк. 4]. Браты Старавольскія ў Гародні з канца XIX ст. пачалі сборку ровараў з закупленых камплектуючых (доказаў поўнага цыкла вытворчасці не знойдзена). Неабходна пагадзіцца з А. Мяцевым, што за выключэннем фабрыкі «Расія» А. Лейтнера ў Рызе (1886) і фабрыкі «Дукс» Ю. Мелера (1893) уся астатняя вытворчасць узнікла з гандлёвых фірм. Як прыклад, прадпрыемства Ф. Танскага «Победа» ў 1893–1898 гг. толькі гандлявала еўрапейскімі мадэлямі ровараў, але з 1898 г. пачала зборку, а з 1900-х і ўласную вытворчасць пэўных дэталей і камплектуючых [3, с. 56].

Пачатак масавых заняткаў фізічнай культурай і спортам пасля 1907 г. прывёў да ўзнікнення ўласна расійскай вытворчасці спартыўнага абсталявання. Гэта адбывалася па некалькіх накірунках. Па-першае, з улікам запыту на гімнастыку ў ваенным асяроддзі, частка вытворчасці была спалучана з вырабам вайсковага рыштунку. Адной з самых буйных кампаній у дадзеным сегменце з 1908 г. быў «Завод военно-походного снаряжения и гимнастических аппаратов А. Лаубе» (апісанне прадпрыемства пазначала свой профіль: выраб абсталявання гімнастычных і фехтавальных залаў і гімнастычных гарадкоў,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

выраб прылад для гімнастыкі І спорту, выраб прадметаў ваенна-паходнага рыштунку) у Санкт-Пецярбургу. Памер гадавой вытворчасці складаў 300 тыс. рублёў (нажаль, долю спартыўнага абсталявання вызначыць складана). Аднак рэклама прадпрыемства падкрэслівала свой статус пастаўшчыка Ваеннага міністэрства, Галоўнай гімнастычна-фехтавальнай школы і афіцэрскіх школ [5, с. 1]. Трэба адзначыць, што на старонках ваеннага выдання «Разведчик» за 1911–1914 гг. прадстаўлена толькі іх рэклама.

Другім накірункам па забеспячэнню ўзнікшага попыту на спартыўнае абсталяванне сталі прадпрыемствы, звязаныя з чэшскай дыяспарай у Расійскай імперыі і дзейнасцю таварыства «Сокал». Сакольскі рух быў вельмі папулярны як у Расійскай імперыі, так і ў беларускіх губернях. Праваднікамі новай сістэмы сакольскай гімнастыкі ў навучальных і ваенных установах былі запрошаныя з аўстра-венгерскіх земляў чэхі і славакі. Франц Стангль у Магілёве рабіў заказы на спецыяльную «сакольскую» форму для заняткаў гімназістаў. Відавочна, што і спартыўнае абсталяванне павінна было адпавядаць дамінуючай мадэлі фізічнай падрыхтоўкі.

У 1910 г. у Вільні адкрылася аддзяленне чэшскай «Фабрыкі гімнастычных снарадаў І. Віндыша і К». Гэта вытворчасць мела сур'ёзную рэпутацыю ў Аўстра-Венгрыі і працавала аж з 1876 г. (але спартыўны профіль атрымала ў 1891 г.). Йозеф Віндыш быў адным з заснавальнікаў таварыства «Сокал» у Сміхаве (зараз раён г. Прага), а яго вытворчасць у Радоціне (спачатку ён займаўся абсталяваннем для вытворчасці піва) па просьбе таварышаў была пашырана на сферу спартыўнага абсталявання для сакольскіх гурткоў. Грунтоўныя каталогі з пералікам асартыменту, фотаздымкамі, гарантаванымі цэнамі на тавар, з некалькімі варыянтамі камплектавання гімнастычных залаў і зараз выглядаюць прывабна [7, с. 46]. Для паспяховай рэалізацыі сваіх тавараў віленская фабрыка Віндыша праводзіла актыўную працу: рэклама ў цэнтральных выданнях Вільні і навакольных губернскіх гарадоў, экскурсіі на вытворчасць для настаўнікаў гімнастыкі. Іх гандлёвыя прапановы дасылаліся па ўсёй Расійскай імперыі. В. Котаў знайшоў цікавы дакумент у сакольскім таварыстве г. Арол, дзе канкурэнцыя за пастаўкі абсталявання ішла паміж віленскай фабрыкай Віндыша, фабрыкай братоў Малы ў Харкаве, кіеўскай «В. Орт і Кашпар» і згаданай вышэй фабрыкай А. Лаубе [1, с. 59].

Узнікненне і дзейнасць кіеўскай фабрыкі «В. Орт і Кашпар» вельмі паказальна. Два інжынеры машынабудаўнічага завода «Крыванека і Грэтэра» (таксама чэхі) Віктар Кашпар і Фердынанд Вітачак стварылі ўласны бізнэс – фабрыку спартыўных прыладаў і адзення. Пасля аб'яднання з крамай «разнастайных гімнастычных і спартыўных прыладаў» Вікенція Орта фірма ў 1909 г. атрымала назву – «Спецыяльная фабрыка гімнастычных прыладаў В. Орт і Кашпар». Тут выпускалі спартовыя снарады для навучальных устаноў, вайсковых частак, клубаў – брусы, турнікі, «кабылы скураныя», шведскія лесвічкі, трапецыі, «прыборы для скокаў, фехтавання, гульняў» і многае іншае. Практыкавалася праца і пад індывідуальны заказ. Акрамя таго, фабрыка выраблялa экіпіроўку для навамодных відаў спорту – футбола, хакея, тэніса, кракету, а таксама «амерыканскія канькі». Падчас рэгістрацыі гімнастычнага таварыства «Сокал» у Кіеве В. Кашпар стаў яго кіраўніком, а В. Орт – членам праўлення. Яны пастаўлялі свой тавар у гарады беларускага Палесся, а Кіеўская алімпіяда 1913 г. дазволіла прадэманстраваць свае магчымасці ўдзельнікам спаборніцтваў (у тым ліку і з беларускіх губерняў) [2, с. 50].

З'яўленне сферы баўлення вольнага часу і гарадскога попыту на спорт прывяло да ўзнікнення трэцяй крыніцы спартыўнага абсталявання – уласна расійскай вытворчасці па еўрапейскіх і сусветных стандартах. Самыя вядомыя прыклады – дзейнасць братоў Максіма і Міхаіла Цыганковых, якія на першым этапе засяродзілі сваю ўвагу на тэнісным абсталяванні. Яны прайшлі складаны шлях па стварэнню тэхналогіі вытворчасці, які складаўся не толькі з распрацоўкі формы і дэталяў, але і паездак за мяжу, дзе яны вучыліся і пераймалі вопыт лепшых фабрык Еўропы. На падставе атрыманых ведаў была створана першая ўласна расійская ракетка «Максім» (толькі струны закупалі ў Велікабрытаніі) [6, с. 122]. Ракеткі такога тыпу да 1915 г. дзякуючы нізкаму кошту паступалі ў гімназіі Магілёва і Гародні, выкарыстоўваліся на кортах у Друкеніках, прыватных сядзібах.

Такім чынам, забеспячэнне спартыўным абсталяваннем у беларускіх губернях на мяжы XIX–XX стст. адлюстроўвала змены ў грамадстве, рост папулярнасці спорту і фізічнай культуры, што прывяло да ўзнікнення уласнай вытворчасці неабходнага інвентара.

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Котов, В. В. Сокольское движение и чешско-русский перевод / В. В. Котов // Материалы междунар. научн. конф. «Перевод как фактор межнациональной истории культуры», 19–22 апреля 2016 г. / отв. ред.: И. Н. Смирнова, Ю. А. Созина. – М. : Центр книги Рудомино, 2016. – С. 54–72.
2. Муратов, А. Чешские промышленные предприятия в Киеве сто лет назад / А. Муратов, Д. Муратова // Шулявка : сб. краев. статей (под ред. В. Лисенко). – Киев, 2011. – С. 25–51.
3. Мятиев, А. Велосипед в дореволюционной России / А. Мятиев. – М. : Русский Антиквариат, 2008. – 296 с.
4. О постройке гимнастического городка в Белостоке // Литовский государственный исторический архив (ЛГИА). – Ф. 567. Оп. 12. Д. 487.
5. Прейс-Курант гимнастических снарядов, принадлежностей для фехтования и спорта. Завод военно-походного снаряжения и гимнастических аппаратов А. Лаубе. – С.-Петербург, 1912. – 40 с.
6. Фоменко, Б. И. История лаун-тенниса в России / Б. И. Фоменко. – М. : Большая Российская энциклопедия, 2000. – 223 с.
7. Doubrava, M. Historie Sokola I. Smichov / M. Doubrava. – Praha, 2011. – 98 s.
8. Ustrzycki, M. Ziemianie polscy na Kresach w latach 1864–1914. Swiat wartosci i postaw / M. Ustrzycki. – Krakow : Arcana, 2006. – 406 s.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова